**Н.В.Алянюк,** *дацэнт*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНСТРУМЕНТАРЫЯ МАРКЕТЫНГУ Ў ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ (вопыт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы)

Выпускнік універсітэта ў сваёй практычнай дзейнасці павінен умець прымаць эфектыўныя рашэнні, а дзеля гэтага яму трэба валодаць не толькі тэарэтычнымі ведамі, але і інструментарыем маркетынгу, які дазваляе правесці аналіз рынку, маркетынгавага асяроддзя, унутраных рэсурсаў арганізацыі (напрыклад, бібліятэкі) і выпрацаваць аптымальную стратэгію.

Зрабіць гэта даволі няпроста нават вопытнаму спецыялісту, таму што даводзіцца мець справу са шматлікімі фактарамі, неадназначнасцю іх уздзеяння на бібліятэку. Тым не менш, як паказвае практыка, сітуацыі нявызначанасці, з якімі так часта сутыкаецца сучасная бібліятэчна-інфармацыйная ўстанова, вырашальныя. Адной з задач курса "Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг" з'яўляецца навучанне студэнта ўменню выкарыстоўваць тэорыю маркетынгу ў канкрэтных умовах. Асноўная мэта навучання пры гэтым заключаецца ў падрыхтоўцы спецыяліста,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якi правiльна аналiзуе сiтуацыю, вырашае праблемы, выяўляе магчымыя прычыны iх з'яўлення, аналiзуе варыянты рашэння, выбiрае найбольш аптымальны з iх, прыводзiць яго ў дзеянне i ажыццяўляе кантроль.

Вялiкую дапамогу ў дасягненнi гэтай мэты могуць аказаць метады разбору канкрэтных сiтуацый (у замежнай практыцы iх называюць кейс-метады). Гэта стымулюе навучэнцаў засвойваць i актыўна выкарыстоўваць метады, прынцыпы, тэхналогii i iншыя iнструменты маркетынгу пры аналiзе, ацэнцы i рашэннi тых праблем i практычных сiтуацый, якiя складваюцца ў бiблiятэцы.

Сiтуацыi, што прапануюцца студэнтам для вырашэння, могуць быць рознымi. У адных даецца характарыстыка бiблiятэчна-iнфармацыйнай установы, студэнту прапануецца прааналiзаваць сiтуацыю, для чаго ён павiнен адказаць на шэраг пытанняў, якiя пастаўлены ў заданнi. Тут можа i не ставiцца задача прыняцця рашэння. Студэнт аналiзуе дадзеную iнфармацыю i пацвярджае свае тэарэтычныя веды.

У iншых выпадках студэнта ставяць перад канкрэтнай сiтуацыяй, яе сiмптомах. Прычына праблемы прама не абазначана, студэнт павiнен выявiць яе самастойна, прааналiзаваць, iншымi словамi, паставiць дыягназ, знайсцi варыянты рашэнняў, якiх можа быць некалькi, i выбраць аптымальны з iх. Прычым выбар павiнен быць абгрунтаваны, неабходна прадугледзець магчымыя наступствы i выявiць магчымыя перашкоды.

Пры выкарыстаннi метаду разбору канкрэтных сiтуацый трэба прытрымлiвацца пэўных умоў, улiчваць асаблiвасцi розных аўдыторый навучэнцаў, арганiзацыйныя правiлы работы ў групе. Акрамя таго, павiнна быць правiльна вызначана роля выкладчыка.

Парадак правядзення заняткаў прадугледжвае наступныя правiлы.

1. *Складанне схемы заняткаў:* указваюцца сiтуацыя, яе сiмптомы, элементы маркетынгавага асяроддзя. Напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апісваюцца бібліятэчна-інфармацыйная ўстанова і знешнія фактары, якія ўплываюць на яе.

2. *Вызначэнне мэты.* Гэта могуць быць ілюстрацыя да тэорыі, і чыста практычная сітуацыя, і іх сумяшчэнне. Але ў любым выпадку мэта павінна быць даволі абгрунтаванай, каб работа зацікавіла студэнтаў.

Пры вырашэнні сітуацыі студэнт не толькі выкарыстоўвае атрыманыя веды, але і праяўляе асабістыя здольнасці, у прыватнасці ўменне працаваць у групе, дэманструе ўзровень разумення справы.

3. *Карэкцыя ходу заняткаў з улікам асаблівасцей работы з рознымі аўдыторыямі.* Пры выкарыстанні метадаў рашэння канкрэтных задач неабходна ўлічваць склад аўдыторыі: гэта студэнты, якія не маюць практычнага вопыту, але валодаюць тэорыяй, ці гэта студэнты-завочнікі, практыкі, якія менш валодаюць тэорыяй або ўвогуле ёю не валодаюць, але маюць практычны вопыт. Розніца паміж імі – ва ўспрыманні сітуацыі, якасці канцэптуалізацыі сітуацый, а таксама ва ўзроўні і якасці прыняцця рашэнняў. Напрыклад, задаецца сітуацыя: у бібліятэцы памяншаецца колькасць карыстальнікаў. Студэнт вочнай формы навучання ўспрымае сітуацыю так, як яна выглядае знешне (менш чытачоў і кнігавыдач), у той жа час практык адразу звязвае яе з магчымымі прычынамі (дэмаграфічны фактар, кваліфікацыя персаналу бібліятэкі, з'яўленне новых канкурэнтаў, недастатковая рэклама ці яе адсутнасць і інш.). Студэнт стацыянара горш канцэптуалізуе сітуацыю, ён не заўсёды можа вырашыць праблему іерархіі інфармацыі, аддзяліць галоўнае ад другараднага. Зрабіць гэта няпроста, таму што галоўнае не заўсёды ляжыць на паверхні. Акрамя таго, студэнты стацыянара маюць тэндэнцыю спрашчаць сітуацыю, што зусім не абгрунтавана, іх адносіны да сітуацыі звычайна эмацыянальныя, тады як у завочнікаў, якія маюць вопыт практычнай дзейнасці, яны больш прагматычныя.

Задача дадзенага метаду навучання менавіта ў тым, каб студэнт не спрошчваў сітуацыю, а стараўся яе растлумачыць, каб

умеў вылучыць галоўнае, прымаць правільныя рашэнні і каб гэтыя рашэнні былі адказнымі. З улікам магчымых наступстваў і магчымых перашкод у студэнта павінен быць выпрацаваны пэўны стэрэатып паводзін. Асноўнае ў дадзенай методыцы – правільны выбар (прынятце правільнага рашэння).

*4. Арганізацыя работы групы.* Як правіла, група разбіваецца на асобныя падгрупы. Вельмі важна, каб работа кожнай падгрупы была правільна арганізавана, таму кожная падгрупа павінна выбраць адказнага, які б каардынаваў яе дзейнасць.

Работа групы дзеліцца на некалькі этапаў:

– прадстаўленне канкрэтнай сітуацыі (задання) выкладчыкам;

– індывідуальнае вывучэнне праблемы кожным членам групы;

– распрацоўка варыянтаў індывідуальных рашэнняў;

– абмеркаванне варыянтаў індывідуальных рашэнняў ў кожнай падгрупе;

– падрыхтоўка да абмеркавання і дыскусія.

У адведзены тэрмін кожная падгрупа павінна падрыхтавацца да агульнага абмеркавання, прадстаўлення свайго варыянта рашэння задачы. Потым выбіраецца падгрупа, якая абвяшчае вынікі сваёй работы.

Астатнія падгрупы выказваюць свой, абавязкова аргументаваны пункт гледжання адносна прапануемага рашэння і ўносяць адпаведныя прапановы. У ходзе абмеркавання могуць узнікнуць рознагалоссі. Падчас агульнага абмеркавання роля выкладчыка павінна заставацца схаванай. Выкладчык выконвае дзве функцыі: рэгулюючую і карэкціруючую, ён павінен умець накіраваць сітуацыю ў патрэбнае рэчышча. Выкладчык як бы перадае свае паўнамоцтвы студэнтам, яго роля зводзіцца да мінімуму. Ён на працягу заняткаў павінен займаць нейтральную пазіцыю, не рабіць ніякіх каментарыяў адносна правільнасці рашэння.

І толькі пасля агульнага абмеркавання выкладчык звяртаецца да традыцыйнай ролі і падводзіць вынікі заняткаў. Для гэтага спачатку трэба звярнуцца да тэарэтычнага матэрыялу і нагадаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго студэнтам. У рашэннях, якія былі прапанаваны студэнтамі, неабходна адзначыць моцныя і слабыя бакі. У адрозненне ад іншых відаў семінарскіх і практычных заняткаў пры выкарыстанні метадаў аналізу канкрэтных сітуацый нельга выстаўляць ацэнкі, дастаткова адзначыць ступень удзелу студэнтаў ў рабоце. Для выяўлення ўзроўню падрыхтаванасці кожнага студэнта дадаткова можна выкарыстоўваць метад тэсціравання па завяршэнні вывучэння кожнага раздзела.

Заданні з выкарыстаннем метаду аналізу канкрэтных сітуацый прапануюцца студэнтам неаднаразова ў працэсе вывучэння курса "Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг". Для разгляду выбіраюцца розныя сітуацыі. Яны могуць быць звязаны з цэнавымі праблемамі, колькасцю і якасцю бібліятэчна-інфармацыйных паслуг і інш. Дадзены метад дазваляе замацоўваць тэарэтычныя веды, авалодаць метадалогіяй, методыкай прафесійнай дзейнасці і паскорыць засваенне практычнага вопыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ